http://edoc.bseu.by

*С. В. Гурбановіч*
*Навуковы кіраўнік — Т. М. Лук'янюк*
*БДЭУ (Мінск)*

# УПЛЫЎ ДЗЕЙНАСЦІ ТРАНСНАЦЫЯНАЛЬНЫХ КАРПАРАЦЫЙ НА ЭКАНОМІКУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Сёння ўплыў транснацыянальных карпарацый (ТНК) на эканоміку розных краін свету бесперапынна расце. Найбуйнейшыя кампаніі дыктуюць умовы не толькі сваім канкурэнтам, але і цэлым дзяржавам. Даходы ТНК перавышаюць аб'ёмы ВУП многіх краін свету, мільёны працоўных месцаў ствараюцца ў кожнай дзяржаве, дзе размешчаны філіялы карпарацыі. Так, згодна спісу Forbes, з 2016 па 2021 г. сукупныя паказчыкі 2000 найбуйнейшых ТНК выраслі па выручцы з 35,0 да 39,8 трлн дал. ЗША, па прыбытку — з 2,4 да 2,5 трлн дал. ЗША, таксама павялічыліся актывы на 163 трлн дал. ЗША і склалі 223,4 трлн дал. ЗША, а рынкавая капіталізацыя дасягнула 79,7 трлн дал. ЗША, павялічыўшыся з 44 трлн дал. ЗША [1, 2]. Першае месца ў рэйтынгу ТНК займае кітайскі банк ICBC (Industrial & Commercial Bank Of China), які за пяць гадоў ажыццяўлення сваёй дзейнасці здолеў павялічыць выручку прыблізна на 20 млрд дал. ЗША, прыбытак — на 1,5 млрд дал. ЗША, актывы — на 1 500 млрд дал. ЗША, рынкавую капіталізацыю — на 50 млрд дал. ЗША.

На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь размясцілі свой капітал такія ТНК, як Coca-Cola, McDonalds, Pepsi, BMW Group, «СберБанк», Microsoft, «Штадлер» і многія іншыя. Таксама прысутнічаюць на рынку розныя сумесныя і замежныя прадпрыемствы: напрыклад, сумеснае беларуска-дацкае прадпрыемства «Маерск Медыкал» выпрабляе аднаразовыя шпрыцы і катэтары.

ЗАТ «Штадлер Мінск» з’яўляецца філіялам швейцарскай міжнароднай кампаніі па вытворчасці чыгуначнага рухомага саставу. У рамках канцэрна Stadler Rail Group беларускае прадпрыемства экспартуе асноўную частку прадукцыі (каля 70 %) у Еўропу. Доля краін СНД у агульным аб'ёме вытворчасці складае каля 30 % [3].

Кампанія Stadler Rail Group за 2018–2019 гг. інвеставала ў завод 27 млн еўра. На пачатак 2020 г. аб'ём фінансавых уліванняў дасягнуў 125 млн еўра. Сёння беларуска-швейцарскае прадпрыемства лічыцца адным з найбуйнейшых інвестыцыйных праектаў у Рэспубліцы Беларусь [3].

Для Беларусі існуе магчымасць прыцягнуць на сваю тэрыторыю ТНК, якія маюць намер выйсці на расійскі рынак, паколькі наша краіна ўваходзіць у ЕАЭС разам з Расійскай Федэрацыяй. Адсочванне тых галін прамысловасці Расіі, якія пакуль знаходзяцца ў стадыі росту, і прадастаўленне сваёй тэрыторыі для рэалізацыі магчымасці для міжнародных кампаній выраблць адпаведную прадукцыю і тавары на экспарт менавіта у нас, павінны быць часткай экспартнай палітыкі дзяржавы.

Найбольш перспектыўнымі прымаючымі дзяржавамі могуць стаць краіны Усходу і ЕАЭС. Існуюць розныя ўмовы, на якіх транснацыянальныя карпарацыі мо-

гуць інвеставаць у Рэспубліку Беларусь. Задача краіны — мінімізаваць адмоўныя фактары, развіваць і ўдасканальваць празрыстасць заканадаўства, паляпшаць становішча малога і сярэдняга бізнесу і г.д. Рэалізацыя такой сістэмы арганізацыйна-эканамічных мерапрыемстваў у рэспубліцы будзе спрыяць росту яе міжнароднай інвестыцыйнай прывабнасці і надзейнасці ў якасці дзелавога партнёра.

У доўгатэрміновай перспектыве гэта паслужыць павышэнню канкурэнтных пазіцый краіны, прыцягненню ў айчынную эканоміку дадатковых аб'емаў ПЗІ і атрыманню максімальнага прыбытку з ўзаемадзеяння нацыянальнай эканомікі з ТНК.

## Крыніцы

1. *Журавлёва, В. В.* Современные тенденции развития транснациональных компаний / В. В. Журавлёва, С. К. Токаева // Науч. изв. — 2016. — № 5. — С. 66–71.

2. GLOBAL 2000: How The World's Biggest Public Companies Endured The Pandemic [Electronic resourse] // Forbes. — Mode of access: https://www.forbes.com/lists/global2000/#5eda77c25ac0. — Date of access: 07.03.2021.

3. *Азаревич, Т.* Белорусские исключения в истории Stadler / Т. Азаревич // Трансп. & Транзит. — 2020. — № 6. — С. 42–49.